**А.І.Смолік,** *прафесар*

# ПАБУДОВА І ПРАДСТАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ ВЕДАЎ У ВУЧЭБНЫМ ДАПАМОЖНІКУ

Сучасная трактоўка мэт і зместу адукацыі праз веды і пазнанне ставіць вышэйшую школу ў супярэчлівую сітуацыю: аб'ём ведаў і колькасць дысцыплін павялічваюцца значна хутчэй, чым удасканальваюцца метады і змест адукацыі. Тэарэтыкі і практыкі ў галіне педагогікі апынуліся перад дылемай: грунтоўна засвойваць невялікую частку ведаў і прадметаў з тых, якія рэальна створаны ў культуры, ці набіраць фрагменты з розных прадметаў і дысцыплін. Гэту сітуацыю неабходна, на наш погляд, улічваць аўтарам падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па гуманітарных дысцыплінах. Структураванне культуралагічных ведаў да таго ж мае шэраг адметнасцей.

Неабходна адзначыць, што культуралогія – адносна маладая навуковая дысцыпліна, у якой яшчэ фарміруецца катэгарыяльны апарат, адпрацоўваюцца метады даследавання розных культурных з'яў і працэсаў. Выкладанне шэрагу культуралагічных дысцыплін фундаментальнага і прыкладнога характару ажыццяўляецца педагогамі, якія не маюць базавай культуралагічнай адукацыі. Складанасць пабудовы культуралагічных ведаў вынікае і з разнастайнасці, шматслойнасці самой культуры. Таму ў вучэбным дапаможніку пры ўсім жаданні немагчыма асвятліць усе аспекты духоўнай і матэрыяльнай культуры. Пры выбары мадэлі прадстаўлення культуралагічных ведаў трэба ўлічваць міждысцыплінарны характар вывучэння культуры. Яна з'яўляецца аб'ектам вывучэння філасофіі, сацыялогіі, антрапалогіі, этналогіі, гісторыі і іншых гуманітарных навук.

Аналіз структуры і зместу падручнікаў, хрэстаматый і вучэбных дапаможнікаў па культуралогіі, якія выйшлі ў апошнія 15 гадоў у Расіі і Беларусі, сведчыць: пры іх напісанні аўтары не заўсёды абапіраліся на ўсталяваную метадалогію сістэматызацыі і структурызацыі гуманітарных адукацыйных ведаў. Асобныя аўтары імкнуліся выкласці ўсё, што вядома аб культуры і культурах. Другая група аўтараў акцэнтавала ўвагу на змене глабальных парадыгм разумення культуры. Асобныя педагогі спрабавалі прадставіць

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуралагічныя веды праз вывучэнне гісторыі мастацкай культуры. Думаецца, усе гэтыя падыходы не вырашаюць праблему сучаснай культуралагічнай адукацыі.

Абагульненне вопыту і выкладання фундаментальнай і прыкладной культуралогіі ў ВНУ культуры і мастацтваў паказвае памылковасць усёахопнага падыходу. Нават калі павялічыць у разы колькасць гадзін на культуралогію, то ў гэтым выпадку немагчыма данесці да студэнтаў увесь культурны досвед чалавецтва. Па-нашым меркаванні, вучэбны дапаможнік павінен вырашаць дзве асноўныя задачы: дапамагчы педагогу і студэнту ўвайсці, акунуцца ў культуралагічны кантэкст і ўзброіць яго сродкамі для арыентацыі ў сацыякультурнай сітуацыі. Зыходзячы з такога разумення, аўтары трох вучэбных дапаможнікаў, якія падрыхтаваны і апублікаваны ў БДУ культуры і мастацтваў за апошнія пяць гадоў, паспрабавалі структураваць вучэбны матэрыял па тэорыі і гісторыі культуры [2; 3; 4]. Заснавальнік школы "Аналаў" Ф.Бродэль сцвярджаў, што структура – гэта ансамбль, архітэктура сацыякультурных з'яў, устойлівая і марудна пераменлівая ў часе [1]. Галоўнае функцыянальнае прызначэнне структуры – ствараць бачанне прадмета вывучэння праз асноўныя сістэмна-структурныя характарыстыкі разглядаемых з'яў і працэсаў культуры. Рэалізацыя такога падыходу патрабуе ўвядзення ў вучэбны дапаможнік як тэарэтычнага, так і практычнага матэрыялу, накіраванага на асэнсаванне працэсу функцыянавання культуры ў грамадстве, сацыякультурных працэсаў, якія адбываюцца ў розных сацыяльных групах, супольнасцях і якія ўплываюць на ўнутраны свет асобы. У сувязі з гэтым у структуры пабудовы і прадстаўлення культуралагічных ведаў вылучаны тры важнейшыя кампаненты: тэорыя культуры, гісторыя культуры; прыкладная культуралогія. У адпаведнасці з такім чляненнем структурных кампанентаў распрацаваны і выдадзены тры самастойныя дапаможнікі: "Культуралогія: тэорыя культуры" [3], "Культуралогія: гісторыя культуры" [4], "Прыкладная культуралогія" [2]. Названыя дапаможнікі заснаваны на ідэі шматаспектнасці, шматмернасці культуры, яе ўсёпранікальным характары і вызначаюць асаблівасці ўсіх грамадскіх з'яў і працэсаў. У гэтым кантэксце ўзаемасувязі і ўзаемадзеяння з улікам тэарэтычных і эмпірычных дасягненняў айчыннай і замежнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуралогіі ў вучэбных дапаможніках разглядаюцца культура і сучасныя грамадскія працэсы, культура і сацыяльныя супольнасці, культура і асоба.

Паняцце "структура" адлюстроўвае пэўную складаную сістэму элементаў, якія ўстойліва ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, або адносін, сувязей, што характарызуюць гэтую сістэму. У сацыяльных і гуманітарных навуках важнейшымі элементамі з'яўляюцца ключавыя канцэпты і катэгорыі. Менавіта ў іх адлюстроўваюцца анталагічны і гнасеалагічны аспекты гуманітарных ведаў. Зыходзячы з кагнітыўнай практыкі, аўтары вучэбных дапаможнікаў па культуралогіі вылучылі на першы план вывучэнне сутнасці і зместу важнейшых катэгорый культуралогіі: *культура, цывілізацыя, дынаміка, традыцыя, каштоўнасць, патэрны, інкультурацыя, акультурацыя* і інш. На наш погляд, раскрыццё сутнасці і зместу катэгорый неабходна ажыццяўляць з дапамогай параўнальнага аналізу. Гэта вынікае з адсутнасці адзіных падыходаў да іх вызначэння. Напрыклад, існуе некалькі соцень азначэнняў паняццяў "культура", "цывілізацыя", "каштоўнасць". Таму ў дапаможніках базавыя катэгорыі культуралогіі разглядаюцца з пазіцый антрапалогіі, аксіялогіі, псіхааналізу, эвалюцыянізму і іншых навуковых падыходаў. Пры гэтым аўтары дапаможнікаў паказваюць эвалюцыю канцэпцый і катэгорый культуралогіі, метадаў і тэхналогій культуралагічных даследаванняў, спосабаў пабудовы і абгрунтавання ведаў аб культуры. У выніку ў студэнтаў павінны сфарміравацца грунтоўныя веды аб базавых, ключавых паняццях, якія ўтвораць тэарэтычную аснову для разумення праблематыкі культуры.

Станаўленне маральных, эстэтычных і сацыяльных арыенціраў, неабходных як для фарміравання светапогляду, так і для культуратворчай дзейнасці спецыялістаў сацыякультурнай сферы, адбываецца падчас вывучэння заканамернасцей будовы культуры і працэсаў яе формаўтварэння ў онта- і філагенезе. На падставе гэтага ў дапаможніку абавязковым яго элементам павінен быць раздзел, прысвечаны марфалогіі культуры. У вучэбным дапаможніку "Культуралогія: тэорыя культуры" ён займае цэнтральнае месца. Перад студэнтамі марфалогія паўстае як анатомія культуры, пры гэтым культура разглядаецца ў якасці жывога арганізма. Аўтары не абмяжоўваюцца толькі апісаннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурных форм, тлумачэннем таго, чаму гэтыя формы ўзніклі. У дапаможніку марфалогія прадстаўлена тэмамі, якія раскрываюць праблемы паходжання культуры, тыпалогіі, дынамікі і мовы.

На наш погляд, важнейшым вынікам культуралагічнай адукацыі з'яўляюцца сацыялізацыя, інкультурацыя і сацыякультурная самаідэнтыфікацыя асобы, гэта значыць самавывучэнне будучага спецыяліста ў сацыякультурнай прасторы, устанаўленне ім сваёй сацыяльнай (у тым ліку прафесіянальнай), этнічнай, палітычнай, канфесіянальнай ідэнтычнасці. Улічваючы гэта, у дапаможнік аўтары ўключылі асобныя тэмы фенаменалогіі культуры. У аснову адбору тэм было пакладзена значэнне, якое маюць пэўныя з'явы, працэсы і феномены культуры для фарміравання ў студэнтаў адносін да свету, прыроды, грамадства, чалавека і да самога сябе. Культура тут разглядаецца ў самым шырокім сэнсе гэтага паняцця, а менавіта як змест грамадскага жыцця і дзейнасці людзей, што ствараюць рознага кшталту артэфакты.

Побач з вывучэннем праблем тэарэтычнай культуралогіі, яе метадалагічных асноў аўтары дапаможнікаў прадугледзелі разгляд гісторыі культуры, этапаў фарміравання культуры. Гістарычны матэрыял выдзелены ў асобны дапаможнік, у якім з выкарыстаннем апорных паняццяў і палажэнняў тэорыі культуры аналізуюцца характэрныя асаблівасці і дасягненні культурных эпох і перыядаў. У гэтым раздзеле разглядаюцца раннія формы культуры першабытнага грамадства, культур старажытнаўсходніх цывілізацый, гісторыя цывілізацыі Заходняй Еўропы. Засваенне дадзенай часткі культуралагічных ведаў дазволіць студэнтам мець дакладнае ўяўленне аб гісторыі сусветнай культуры, прадстаўленай бясцэннымі эталонамі творчасці. Структурныя элементы дапаможніка ствараюць скразную лінію гістарычнага развіцця культуры чалавецтва. У адрозненне ад шэрагу вучэбных дапаможнікаў па культуралогіі ў аналізуемым вучэбным дапаможніку значнае месца займаюць пытанні аб гістарычных перадумовах і аб перспектывах самазахавання ментальных і стылістычных асноў беларускай нацыянальнай культуры. Амаль ва ўсе раздзелы дапаможніка ўключаны матэрыял, які асвятляе складаныя гістарычныя этапы, тэндэнцыі і формы развіцця беларускай культуры, дыялог яе з культурай суседніх этнічных супольнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На постсавецкай прасторы ў XXI ст. актыўна ідзе працэс фарміравання прыкладной культуралогіі. Гэты ўзровень пазнання культуры ўяўляе сабой трансфармацыю тэарэтычных ведаў у тэхналогію эфектыўнага ўзаемадзеяння чалавека з соцыумам. Прыкладная культуралогія развіваецца не толькі як навуковая, але і вучэбная дысцыпліна. Яна ў цяперашні час уключана ў вучэбныя планы шэрагу гуманітарных ВНУ. Праўда, у адрозненне ад фундаментальнай культуралогіі да сённяшняга часу распрацаваны і выдадзены толькі адзін вучэбны дапаможнік [2]. Яго аўтарамі (Я.Д.Грыгаровіч, А.І.Смолік) выкарыстана інтэгратыўная мадэль пабудовы ведаў па прыкладной культуралогіі. Разгляд усёахопнага працэсу далучэння чалавека да свету культуры і сацыякультурнай творчасці ажыццяўляецца на аснове міждысцыплінарнага падыходу. Пры асвятленні комплексу пытанняў, звязаных з вывучэннем і распрацоўкай методыкі фарміравання культуры індывіда, выяўлення аб'ектыўных магчымасцей забеспячэння рознабаковага развіцця асобы ў сферы культуры, маральна-эстэтычнага патэнцыялу сацыякультурнай дзейнасці, аўтары выкарыстоўваюць асобныя прынцыпы і метады шэрагу гуманітарных навук: сацыялогіі культуры, сацыяльнай педагогікі, лінгвакультуралогіі, псіхалогіі, менеджменту.

На наш погляд, важнейшымі складнікамі структуры падручніка па прыкладной культуралогіі павінны быць раздзелы, у якіх разглядаюцца праблемы інстытуцыялізацыі культурнай дзейнасці, дзяржаўнага рэгулявання культурна-творчай дзейнасці, арганізацыі сацыякультурнай дзейнасці, менеджменту ў сферы культуры, фарміравання асобы ў працэсе засваення культуры. Нельга абысці, думаецца, пытанні ўзнаўлення індывідуальнай і грамадскай каштоўнасці чалавека сродкамі мастацтва і творчага самавыяўлення. Справа ў тым, што сучасная сацыяльная сітуацыя ў свеце характарызуецца нарастаннем колькасці гуманітарных, экалагічных і тэхнагенных катастроф, эканамічных крызісаў, якія спараджаюць масавыя стрэсавыя парушэнні ў людзей. Асоба, якая фарміруецца ў такіх умовах, мае вострую патрэбу ў сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі, у добра арганізаванай рэадаптацыі да новых умоў жыццядзейнасці. Менавіта з гэтага зыходзілі аўтары дапаможніка, уключыўшы ў яго матэрыял, які паказвае будучым спецыялістам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыякультурнай сферы месца і ролю культуры ў адаптацыі асобы да неспрыяльных умоў жыццядзейнасці сродкамі культуры.

З навуковага асэнсавання сутнасці, прыроды і спецыфікі сацыякультурнай дзейнасці вынікае патрэба тэарэтычнага абгрунтавання прафесіяграмы яе арганізатараў, гэта значыць спецыялістаў сацыякультурных устаноў, якіх рыхтуюць ВНУ культуры і мастацтваў. Таму ў "Прыкладной культуралогіі" маецца значны раздзел, у якім утрымліваюцца сутнасная характарыстыка сучасных кадраў культуры, асноўныя кіраўнікі кадравай палітыкі, змест і формы культуралагічнай адукацыі.

Такім чынам, прапануемая мадэль пабудовы культуралагічных ведаў, на наш погляд, можа садзейнічаць якаснаму метадалагічнаму забеспячэнню выкладання ўсіх галін культуралогіі. Прапанаваныя метады пабудовы адукацыйных культуралагічных ведаў дазваляюць сістэматызаваць веды аб культуры, стварыць тэарэтычныя мадэлі культурных функцый і працэсаў, сістэмы спосабаў і інструментарый для даследавання культуры і кіравання сацыякультурнымі працэсамі.

---

1. *Бродель, Ф.* История и общественные науки. Историческая деятельность / Ф.Бродель // Логика и методология истории. – М., 1997. – С. 124–213.

2. *Грыгаровіч, Я.Д.* Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці "культуралогія" ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / Я.Д.Грыгаровіч, А.І.Смолік. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 216 с.

3. *Смолік, А.І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

4. *Смолік, А.І.* Культуралогія: гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А.І.Смолік, Л.К.Кухто, А.А.Цобкала. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 311 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ